В.І.Саітава, канд. пед. навук, ст. выкл. МІК
С.В.Зыгмантовіч, канд.пед. навук, дац. МІК

## І.Б.СІМАНОЎСКІ І ТЭАРЭТЫКА-АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ РАЗВІЦЦЯ БІБЛІЯГРАФІІ

У шматграннай дзейнасці выдатнага арганізатара бібліятэчна-бібліяграфічнай справы на Беларусі І.Б.Сіманоўскага важна выпучыць яго дзейнасць як віднага вучонага-бібліяграфазнаўца, з пункту гледжання сённяшняга дня высветліць яго уклад у развіццё бібліяграфічнай тэорыі і практыкі. Такая задача тым больш складаная, адказная і цікавая, што ў асобе І.Б.Сіманоўскага талент бібліёграфа-тэарэтыка зліты з талентам буйнейшага кіраўніка бібліятэчна-бібліяграфічнай справы.

Погляды І.Б.Сіманоўскага па пытаннях бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці знайшлі адлюстраванне ў яго прамовах на шматлікіх навуковых канферэнцыях, І і ІІ Усерасійскіх бібліяграфічных з'ездах, публікацыях выступленняў, артыкулах, у манаграфіі "Беларуская савецкая бібліяграфія".

Вывучэнне гэтых дакументаў дазваляе разглядаць погляды І.Б.Сіманоўскага аб бібліяграфіі ў двух аспектах: агульнатэарэтычным і ў адносінах да развіцця бібліяграфічнай інфармацыі ў рэспубліцы. Пры ўсёй умоўнасці гэтага падзялення такі падыход дазваляе найбольш выпукла ахарактарызаваць шырокі тэарэтычны кругагляд выдатнага тэарэтыка і арганізатара -- практыка бібліяграфічнай справы.

Тэарэтычныя ўяўленні І.Б.Сіманоўскага склаліся і развіваліся пад рознымі ўплывамі. Па-першае, на яго бібліяграфічны светапогляд значны ўплыў аказала шырока прызнаная ў 20-я гады кваліфікацыя бібліяграфіі як кнігазнаўчай дысцыпліны. Па-другое, кожнае выступленне і публікацыя І.Б.Сіманоўскага,



кожнае яго дзеянне прасякнуты гарачым жаданнем высока падняць грамадскую ролю бібліяграфіі, арганізаваць яе па-новаму на дзяржаўнай аснове.

У дакладзе на І Усерасійскім бібліяграфічным з'ездзе І.Б.Сіманоўскі разглядаў бібліяграфію ў складзе кнігазнаўства як агульнай навукі аб кнізе. У адрозненне ад многіх вядомых яго сучаснікаў -- Б.С.Баднарскага, М.М.Куфаева, Я.І.Шамурына і іншых -- самастойнасць бібліяграфіі як навуковай дысцыпліны выклікала ў яго сумненні. І.Б.Сіманоўскі лічыў, што бібліяграфія не набыла яшчэ паўнаты атрыбуцыі, неабходнай для самастойнай дысцыпліны, і падкрэсліваў, што, на яго думку, у бібліяграфіі склаўся толькі "пэўны спецыяльны метад". У далейшым развіцці кнігазнаўства падзеліцца на самастойныя часткі. "Заўчасная дыферэнцыяцыя кнігазнаўства на самастойныя часткі можа прывесці да метадалагічнай блытаніны", -- засцерагаў І.Б.Сіманоўскі. З сённяшніх пазіцый нельга аднесці агульную трактоўку І.Б.Сіманоўскім бібліяграфіі да ліку авангардных (перадавых, гістарычна перспектыўных) на свой час, таму што ўжо на І Усерасійскім бібліяграфічным з'ездзе Н.Ю.Ульяненскі і асабліва Я.П.Грабеншчыкоў больш дакладна раскрылі структуру бібліяграфіі, як тэарэтычны раздзел.

Погляды І.Б.Сіманоўскага вартыя ўвагі сваёй патрабавальнасцю да структуры бібліяграфічнай навукі і яе метадалагічнага апарата. Бібліяграфічны метад І.Б.Сіманоўскі адзначыў як "закончаны метад арганізацыі і папярэдняй апрацоўкі належнага навуковаму даследаванню і абагульненню" літаратурнага матэрыялу і называў яго адным з асноўных метадаў навуковага бібліятэказнаўства. Праявы гэтага метаду бачыў у дасягненнях дзесятковай сістэмы і лічыў, што склаўся ён гістарычна ў працэсе развіцця прыёмаў і формаў бібліяграфічнай работы і можа мець таксама прымяненне ў выкладчыцкай і навуковай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такое тлумачэнне метаду і яго ролі пацвярджае паслядоўнасць кнігазнаўчага разумення бібліяграфіі, уласцівае І.Б.Сіманоўскаму. Пераважная ўвага да дакументаў, як аб'ектаў бібліяграфіі прывяла прадстаўнікоў кнігазнаўчага падыходу да такіх буйных дасягненняў, як распрацоўка дзесятковай класіфікацыі, развіццё цэнтралізаванай каталагізацыі друкаваных твораў, да намаганняў па стандартызацыі бібліяграфічнага апісання і выпрацоўцы адзіных прынцыпаў і правілаў каталагізацыі. Так, І.Б.Сіманоўскі вельмі высока і рэалістычна ацэньваў стварэнне "дэцымальнай сістэмы"*, называў яе этапам у развіцці бібліяграфічнай думкі. Галоўным дасягненнем лічыў распрацоўку сістэмы вызначальнікаў, якія ў спалучэнні з сістэматычным індэксам стваралі магчымасць самага шырокага і шматаспектнага адлюстравання дакументаў. Разам з тым, І.Б.Сіманоўскі адзначаў недасканаласць асноўных дзяленняў і прадбачыў неабходнасць змененняў, сумняваўся ў міжнароднасці гэтай сістэмы, хаця станоўча ацэньваў яе каардынацыйны эфект.

Прызнанне бібліяграфічнага метаду ў якасці важнейшага метаду навуковага бібліятэказнаўства дапамагло І.Б.Сіманоўскаму паставіць і бліскуча вырашыць праблему сутнасці і характару дзейнасці навуковай бібліятэкі**. Ён бачыў будучыню навуковых

* Назва УДК уведзена толькі ў 2-м выданні табліц у 1927--1932 гг.

** У першай палове 20-х гадоў у параўнанні з заходнімі краінамі, перш за ўсе з ЗША, у СССР бібліяграфічная дзейнасць у вялікіх універсальных і спецыяльных навуковых бібліятэках вялася нязначна. Так, даведачныя бюро, якія ў далейшым былі пераўтвораны ў даведачна-бібліяграфічныя аддзелы, упершыню з'явіліся у Румянцаўскай бібліятэцы і Публічнай бібліятэцы імя М.Я.Салтыкова-Шчадрына ў канцы 1918 г.



бібліятэк не як пасіўных кнігасховішчаў, а як актыўных бібліяграфічных установаў ці, як казаў Іосіф Бенцыянавіч, бібліяграфічных інстытутаў. Яго выступленне на І Усерасійскім бібліяграфічным з'ездзе, якое ён скончыў гарачым заклікам развіваць бібліяграфічную функцыю (дзейнасць) у буйнейшых кнігасховішчах, было сустрэта з вялікай прыхільнасцю. У падыходах да арганізацыі бібліяграфічнай дзейнасці І.Б.Сіманоўскі прыкметна разыходзіўся з такім значным аўтарытэтам таго часу як Л.Н.Трапоўскі, які настойваў на стварэнні самастойных бібліяграфічных інстытутаў. І.Б.Сіманоўскі ж даказваў мэтазгоднасць надаць функцыі нацыянальных і краявых бібліяграфічных інстытутаў дзяржаўным і вялікім навуковым бібліятэкам ("энцыклапедычнага" характару).

Ідэя арганізацыі бібліяграфічнай работы ў дзяржаўных бібліятэках прывяла І.Б.Сіманоўскага да пытання аб кіраванні сістэмай бібліяграфічнай дзейнасці. Варта адзначыць, што І.Б.Сіманоўскі ў сярэдзіне 20-х гадоў абгрунтаваў неабходнасць стварэння ў рэспубліцы нацыянальнага бібліяграфічнага цэнтра і арганізацыі ўсесаюзнай асацыяцыі бібліяграфічных установаў з адным арганізацыйным і метадычным цэнтрам (у якасці яго прапанаваў усесаюзны бібліяграфічны інстытут).* Гэты цэнтр павінен выконваць каардынацыю работы аўтаномных, рэспубліканскіх бюро і праводзіць бібліяграфічныя з'езды, ствараць цэнтралізавана крыніцы агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі айчыннай і замежнай літаратуры.

Рэспубліканскім бібліяграфічным цэнтрам І.Б.Сіманоўскі спачатку ўяўляў Бібліяграфічнае бюро,

*Наогул, ідэя нацыянальных і бібліяграфічных цэнтраў у большасці краін сфарміравалася значна пазней у працэсе распрацоўкі канцэпцыі нацыянальнага бібліяграфічнага ўліку новых выданняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якое пэўны час існавала як орган кааперавання работы па стварэнню картатэкі беларусазнаўчай літаратуры і даведачнаму бібліяграфічнаму абслугоўванню.

Значную цікавасць уяўляе вывучэнне поглядаў І.Б.Сіманоўскага на бібліяграфічнае навучанне. Ён настойваў на бібліяграфічнай адукацыі студэнтаў розных вышэйшых навучальных устаноў і, як знакаміты М.Дзьюі, даказваў, што авалоданне бібліяграфічным метадам дазваляе студэнтам самастойна набываць веды па выбранай спецыяльнасці. Ён таксама лічыў, што ўвядзенне бібліяграфічных семінараў па спецыяльных дысцыплінах будзе садзейнічаць больш паглыбленаму іх вывучэнню.

Па тэарэтыка-арганізацыйных праблемах якія, пачынаючы з 1926 г.,займаюць І.Б.Сіманоўскага больш, чым абстрактна-тэарэтычныя і метадалагічныя пытанні, ён лічыў неабходным стварыць дасканалую сістэму бібліяграфіі на дзяржаўнай аснове. Гэта ідэя цалкам захапіла І.Б.Сіманоўскага. Ён добра ўяўляў, што ўпершыню ў гісторыі бібліяграфіі ўзнікла магчымасць цалкам пабудаваць бібліяграфічную сістэму на дзяржаўнай аснове, каб развіць буйную калектыўную бібліяграфічную працу, пазбегнуць хібаў той гістарычнай стадыі, калі яна знаходзілася на ўзроўні "індывідуальных спроб".

Тэарэтыка-арганізацыйныя пытанні, якія распрацаваў І.Б.Сіманоўскі, сведчаць аб імкненні стварыць сістэму бібліяграфічнай інфармацыі, заснаваную на прынцыпах цэнтралізацыі, каардынацыі і рацыянальнай арганізацыі. Дзеля гэтага, як адзначыў ён у прамове на II Усерасійскім бібліяграфічным з'ездзе, патрэбна выдзеліць чатыры асноўныя напрамкі развіцця бібліяграфіі: стварэнне дзяржаўнай службы бібліяграфічнай інфармацыі і каардынацыі яе работы ва ўсесаюзным маштабе, рацыяналізацыя бягучай бібліяграфічнай дакументацыі, пастаноўка работы па рэтраспектыўнай бібліяграфіі, як мага больш



поўнае, эканомнае і прыкладное выкарыстанне вынікаў бібліяграфічнай работы.

Многія з гэтых і іншых ідэй І.Б.Сіманоўскі змог ажыццявіць на практыцы. Таму вывучэнне матэрыялаў, прысвечаных пытанням арганізацыі бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці на Беларусі, дазваляе сцвярджаць, што І.Б.Сіманоўскаму належыць першая цэласная канцэпцыя стварэння рэспубліканскай бібліяграфічнай інфармацыі. Наступная была распрацавана В.Е.Лявончыкавым ва ўмовах новага якаснага стану бібліятэчна-бібліяграфічнай справы і на новым тэарэтыка-метадалагічным фундаменце.

Тэарэтычна-арганізацыйныя ідэі аб бібліяграфіі І.Б.Сіманоўскі ўкараніў у дзейнасць Дзяржаўнай (Нацыянальнай) бібліятэкі Беларусі. Спачатку ён лічыў, што рэспубліканскім цэнтрам бібліяграфічнай работы павінна быць Беларускае бібліяграфічнае бюро. Але тэарэтычнае асэнсаванне бібліяграфічнай функцыі навуковай бібліятэкі спрыяла змене погляdaў. Як кіраўнік Дзяржаўнай бібліятэкі І.Б.Сіманоўскі імкнуўся развіваць яе бібліяграфічную дзейнасць. Ён стаў ініцыятарам работы Беларускай кніжнай палаты (уваходзіла ў склад Дзяржаўнай бібліятэкі) па дзяржаўнаму бібліяграфічнаму ўліку твораў друку, статыстыкі друку і выдання "Летапісу друку БССР".

Пад кіраўніцтвам І.Б.Сіманоўскага ў 20-я гады разгарнулася шырокая дзейнасць па рэтраспектыўнаму нацыянальнаму бібліяграфічнаму ўліку. Былі падрыхтаваны і выданы паказальнікі ў серыі "Летапіс беларускага друку".

Імкненне Сіманоўскага актывізаваць прапаганду кнігі для масавага чытача выразілася ў арганізацыі ў Дзяржаўнай бібліятэцы першага ў СССР самастойнага рэкамендацыйна-бібліяграфічнага падраздзялення -- аддзела рэкамендацыйнай бібліяграфіі. На працягу ўсёй творчай дзейнасці І.Б.Сіманоўскі клапаціўся аб пошуку аптымальных форм рэкамендацыйна-бібліяграфічнай інфармацыі. Шэраг яго прапаноў былі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэалізаваны. Так, з 30-х гадоў Сіманоўскі настойліва шукаў найлепшае ўвасабленне для органа бягучай універсальнай рэкамендацыйнай бібліяграфіі. І сёння самае папулярнае ў беларускіх бібліятэках бібліяграфічнае выданне-- "Новыя кнігі Беларусі"-- было створана па яго плану.

І.Б.Сіманоўскі добра ўсведамляў, што бібліяграфічная дзейнасць павінна развівацца на грунтоўнай навуковай падставе. Невыпадкова у пачатку 30-х гадоў у Дзяржаўнай бібліятэцы была адкрыта аспірантура; першымі аспірантамі сталі супрацоўнікі бібліяграфічнага аддзела.

Пытаннем, якому І.Б.Сіманоўскі прыдаваў выключнае значэнне, была каардынацыя бібліяграфічнай дзейнасці. Ён бачыў у каардынацыі шмат эканомнай і рацыянальнай арганізацыі бібліяграфічнай інфармацыі. Разглядаючы беларускую бібліяграфію ў складзе шматнацыянальнай савецкай бібліяграфіі, Сіманоўскі імкнуўся арганізаваць шырокае выкарыстанне бібліяграфічнай інфармацыі агульнасаюзных цэнтраў на рускай мове. Вядомы яго звароты ў ДБЛ СССР аб атрыманні для рэспублікі дастатковай колькасці экземпляраў рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў; шматлікія выступленні па праблемах каардынацыі і дзейнасці кніжных палат.

На жаль, І.Б.Сіманоўскі не дастаткова асэнсаваў самастойнасць беларускай дзяржавы і ў яго выступленнях назіраецца падмена паняццяў "дзяржава" і "край", а часам недаацэньвалася важнасць развіцця некаторых напрамкаў бібліяграфіі. І.Б.Сіманоўскі быў першым даследчыкам гісторыі беларускай бібліяграфіі. Яго манаграфія "Беларуская савецкая бібліяграфія" -- грунтоўнае даследаванне бібліяграфічнай работы Дзяржаўнай бібліятэкі з часу заснавання да пачатку 60-х гадоў.

Агульны ўклад І.Б.Сіманоўскага ў развіццё тэарэтыка-арганізацыйных асноў бібліяграфіі, арганізацыю бібліяграфічнай дзейнасці ў рэспубліцы можна



параўнаць з роляй найбольш выдатных бібліёграфаў XX стагоддзя.

Е.К.Александрова, зам. директора Государственной библиотеки Украины

## НАЦИОНАЛЬНАЯ СИСТЕМА БИБЛИОТЕК УКРАИНЫ: СОВРЕМЕННЫЕ ТЕНДЕНЦИИ И ПРОБЛЕМЫ

(Сообщения на межведомственной конференции Беларуси "Библиотека и общество", октябрь 1992 г.)

Со дня провозглашения независимости Украины прошло немного времени, однако уже сделаны первые шаги по неведомой до сих пор дороге вхождения республики в мировое цивилизованное сообщество: определены герб, флаг, гимн Украины; установлены дипломатические отношения со 100 странами мира; 125 стран признали ее как государство. Выработаны и начинают действовать законы, которыми руководствуются и библиотеки: "Основы законодательства Украины о культуре", определившие стабильный уровень отчислений на отрасль не менее 8% национального дохода; об информации; на рассмотрении в правительстве закон о печати, на очереди -- о библиотеках. Действует Закон Украины о языках.

Создаются условия для национально-духовного развития. Активно работают Всеукраинское общество "Просвіта" им. Тараса Шевченко, Международная и республиканская ассоциация украинистов, Фонд культуры; остановлен процесс вымирания украинских школ. Возрождена Киево-Могилянская академия; создано более 200 учебных заведений новых типов -- лицеев, гимназий, колледжей, воскресных церковных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ